# Брэслаў Барыс Абрамавіч
# (1882-1943)



Брэслаў Барыс Абрамавіч — удзельнік рэвалюцыйнага руху, публіцыст.

Нарадзіўся 10 кастрычніка 1882 года ў в. Мікуліна Талачынскага раёна.

Член РСДРП з 1899 года. У 1901 годзе за кіраўніцтва забастоўкай у Віцебску сасланы ва Ўсходнюю Сібір.

З 1904 года вёў партыйную работу ў Пецярбургу, Мікалаеве, Днепрапятроўску, Маскве, Екацярынбургу. У 1909-1911 гг. быў слухачом партыйнай школы ў Ланжумо (Францыя).

Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 года — супрацоўнік газеты "Праўда" (1917), рэдактар газеты "Голас праўды" ў Кранштаце.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года — дэлегат I Віцебскага губернскага з'езда Саветаў, член Віцебскага губвыканкама. З 1918 года — сакратар Віцебскага губкама РСДРП(б) — РКП(б). З чэрвеня 1918 года — на партыйнай і савецкай рабоце ў Віцебску, Маскве.

У 1924–1925 гг. — на савецкай, гаспадарчай і дыпламатычнай рабоце.

Член ВЦВК у 1918–1919 гг.

З 1930 года працаваў намеснікам паўпрэда ў Францыі.

Барыс Брэслаў пісаў успаміны пра У. І. Леніна, збіраў звесткі пра яго жыццё і дзейнасць.

З'яўляецца аўтарам брашур: "Характар і этапы рускай рэвалюцыі", "Тры дні лютага 1917 года", "Напярэдадні Кастрычніка 1917 года" і артыкулаў пра жыццё і дзейнасць рэвалюцыянераў Сярго Арджанікідзе, Рыгора Пятроўскага, Канкордыі Самойлавай, Сямёна Сямкова. Больш за ўсё друкаваўся ў гісторыка-рэвалюцыйным часопісе "Каторга и ссылка".

Удзельнічаў у распрацоўцы дакументальнай гісторыі палітычнай турмы, ссылкі і эміграцыі. За рэвалюцыйную дзейнасць быў чатыры разы арыштаваны. Рэпрэсаваны ў 1937 годзе.

Памёр 20 красавіка 1943 года ў турме.

Рэабілітаваны ў 1956 годзе.

# Дадатковыя матэрыялы аб жыцці і дзейнасці:


1. **Бреслав Борис Абрамавич** // Витебская губерния: политические портреты в документах и материалах. 1917–1924 гг. / сост. : Н.В. Воронова [и др.]. — Витебск : Витебская областная типография, 2016. — С. 207–208.
2. **Карніловіч, Э.А.** Брэслаў Барыс Абрамавіч / Э.А. Карніловіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал. : Г.П. Пашкоў [і інш.]. — Мінск : БелЭн, 1996. — Т. 3 : Беларусы-Варанец. — С. 284.
3. **Карніловіч, Э.А.** Слухач школы ў Ланжумо / Э.А. Карніловіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Талачынскага раёна / рэдкал.: І.П. Шамякін [і інш.] ; мастак А.М. Хількевіч. — Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 1988. — С. 76–80.


# Інтэрнэт-рэсурсы:


1. **Барыс Абрамавіч Брэслаў** : [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : https://be.wikipedia.org/wiki/Барыс_Абрамавіч_Брэслаў. — Дата доступу : 03.11.2022.
2. **Брэслаў Барыс Абрамавіч** : [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : http://pridvinie.vlib.by/index.php/mtree-lib/pismenniki-paety-litaratary/bresla-barys-abramavich. — Дата доступу : 03.11.2022.
3. **Брэслаў Барыс Абрамавіч** : [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : https://bis.nlb.by/ru/documents/135563. — Дата доступу: 03.11.2022.